2 СНЕЖНЯ 1937 г. № 20 (50)

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН парткома, прафкома і рэктарыята Беларускага дзяржаўнага універсітэта

У сэрцах працоўнага чалавецтва вечна будзе жыць памяць аб палкім трыбуне,

Сергею Міронавічу КІРАВУ,

ПАЎШАГА АД РУК АЗВЯРЭЛАЙ ТРАЦКІСЦКА-ЗІНОЎЕЎСКАЙ СВОРЫ

ЯГО ІМЯ—СЦЯГ БАРАЦЬБЫ

Сёння працоўныя краіны соцыялізма схіляюць свае сцягі перад светлай памяццю аднаго з лепшых сыноў, любімейшых правадыроў народа, палкага барацьбіта за комунізм Сергея Міронавіча Кірава. Тры годы таму назад яго выдатнейшае, кіпучае жыццё было абарвана здрадніцкай пуляй забойцы з подлай трацкісцка-зіноўеўскай банды.

Сергей Міронавіч Кіраў быў адданым барацьбітом партыі Леніна—Сталіна, выратаваўшай нашу краіну ад гібелі ў омуце імперыялізма і вывеўшай яе на шырокі прастор соцыялістычнага працвітання. Ён быў плоць ад плоці той партыі, якая скінула ўладу капітала і запаліла непагасімы маяк соцыялізма на адной шостай частцы свету. Ён быў бліжэйшым вучнем, саратнікам, другам таварыша Сталіна.

За 30 год самаадданай рэволюцыйнай работы Кіраў прайшоў шлях ад радавога байца да аднаго з любімых правадыроў партыі, народа. У рэволюцыйным падполлі, у царскіх казематах, над градам белагвардзейскіх снарадаў, у нафтавых вышках Баку, на заводах Ленінграда — усюды благародства яго сэрца, яснасць розуму, прамата і непахіснасць характару, бліскучая адоранасць былі без астатку пастаўлены на службу велізарнейшай мэты, за якую калі-небудзь вяло барацьбу чалавецтва.

Яго акрыляла палкая вера ў пабудову соцыялізма ў нашай краіне, у канчатковую перамогу комунізма. Яго кіпучая энергія паскарала і аблягчала рух мас да соцыялізма. Яго непараўнальны талент арганізатара і кіраўніка, уладаўшага цудоўным дарам натхняць і ўзнімаць людзей, удесяцярыць іх сілы. Ён ведаў словы, якія ідуць да самага сэрца народа. За контурамі велічнай пабудовы ён заўсёды бачыў жывых людзей, Сталінскімі клопатамі аб іх штодзённых патрэбах было поўна жыццё гэтага вялікага чалавека, бязмежна блізкага і дарагога мільёнам. «Наш Міроныч»,—звалі рабочыя гор. Леніна. Колькі цяпла і любві укладвалася ў гэтыя словы!

Портрет С.М.Кирова

У аднэй з сваіх апошніх прамоў Сергей Міронавіч гаварыў:

— «Мы тут, на адной шостай частцы зямной сушы, бачым, як з дня ў дзень, і з гадзіны ў гадзіну куецца новае соцыялістычнае грамадства, будуецца сапраўды магутнае жыццё працоўных, і трэба быць сляпым, каб не бачыць як зараз **увесь зямны шар раскалоўся на два гіганцкіх, але няроўных поўшар'і: на адным ноч, змрок і запусценне і мёртвае слова—смерць, на другім—жыццё, работа і творчасць і пераможнае слова — наперад да новага жыцця. І, таварышы, няма людзей шчаслівейшых тых, якія завуцца большэвікамі. На гэтым поўшар'і мы з вамі нясем уперад гэты пераможны сцяг, і мы бясспрэчна пераможам, калі будзем вернымі заветам Леніна, калі будзем следаваць указаниям нашага любімага Сталіна».**

Кіраў паў у барацьбе двух светаў. Яго сразіла пуля, пасланая аб'яднаным лагерам Троцкага, Зіноўева і Гесталю. Адкіды рэволюцыі ненавідзелі Кірава за тое, што яго горача любілі працоўныя. Яго непрымірымасць да класавых ворагаў увасабляла барацьбу святла супроць цемры, розуму супроць шаленства, вернасці супроць здрадніцтва, гонару супроць подласцей.

Пройдуць вякі, але ў сазнанні будучых пакаленняў вечна будзе жыць авеяны славай і любоўю народнай незабыўны вобраз беззаветнага, крыштальна-чыстага барацьбіта той вялікай эпохі, калі ў барацьбе двух светаў рашаецца лёс чалавецтва, — вобраз палкага трыбуна соцыялістычнай рэволюцыі Сергея Міронавіча Кірава.

Справу тваю давядзем да пераможнага канца

(На жалобным сходзе БДУ)

Тры талы назад ад рукі подлых наймітаў фашызма, трацкісцка-зіноўеўскіх бандыцатаў, загінуў на баявым посту любімец партыі і ўсяго народа, Сергей Міронавіч Кіраў. Памяць аб любімым Міронычы будзе вечна жыць у нашых сэрцах.

Першага снежня студэнты і навуковыя работнікі універсітэта сабраліся на жалобны сход. У нрынятай рэзалюцыі гаворыцца:

Трацкісцка-зіноўеўскія банды, подлыя наймітыфашызма выстралам 1 снежня 1934 года абарвалі выдатнае жыццё Сергея Міронавіча Кірава. Гэтым выстралам бандыты хацелі ўнесці замяшацельства ў стальныя рады большэвіцкай гвардыі. Але здраднікі пралічыліся. Подлае забойства выклікала абурэнне ва ўсёй краіне. Працоўныя яшчэ цясней згуртаваліся вакол комуністычнай партыі, вакол любімага правадыра таварыша Сталіна.

Народная памяць з любоўю хавае вобраз крыштальна-чыстага большэвіка, баявога саратніка і друга вялікага Сталіна. Совецкая моладзь увасабляе ўсе кіраўскія якасці — прынцыповасць, пвёрдасць, непрымірымасць да ворагаў, большэвіцкую пільнасць.

Мы совецкая моладзь, павінны памятаць і ніколі не забываць аб капіталістычным акружэнні. Памятаць і ніколі не забываць, што пакуль існуюць капіталістычныя краіны да нас будуць засылацца шпіёны, дыверсанты, розныя бандыты, сярод якіх актыўную ролю адыгрываюць трацкісты, зіноўеўцы, бухарынцы. Мы павінны вышэй узняць большэвіцкую пільнасць, да канца выкарчоўваць трацкісцка-зіноўеўскіх-бухарынскіх бандытаў.

Цясней згуртуемся вакол нашай партыі і вялікага правадыра, настаўніка, нашага роднага бацькі таварыша Сталіна!

У дзень 12 снежня, у дзень усенароднага свята, мы яшчэ раз прадэманструем нашу любоў і адданасць партыі і правадыру народаў таварышу Сталіну. Мы ўсе як адзін будзем галасаваць за нашых любімых дэпутатаў у Вярхоўны Совет Саюза ССР, жалезнага наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава і таварыша Ванеева.

Дараці Сергей Міронавіч Кіраў! Памяць аб табе будзе вечна жыць у нашых сэрцах, справу за якую ты аддаў сваё жыццё мы давядзем да пераможнага канца.

СЛОВО СКОРБИ

Эта печальная весть дошла до меня, когда о другом я думал, Мироныч. Стиснув зубы до крови, до боли в висках, я осмотрел свое оружие. Горе мне! Почему меня не было рядом с тобой, чтобы остановить пулю злодея? Горе мне! Почему меня не было рядом,—я бы грудью своей защитил тебя, верный товарищ.

Друг и соратник Сталина! Лучший из лучших боец!...

Эту песню слагая, клянусь, я не в силах сдержать стон. От лютой ненависти к врагу дрожит мое тело.

Я вышел из сакли. Была тишина над горами. Туман расстилался в ущельях. Птица сидела на голой земле, сиротливо нахохлившись.

— Что с тобой? — спросил я ее. — Ведь рядом зеленый сад, в котором скучают по песне твоей высокие ветви и листья. Что ж ты, замолкнув, сидишь в стороне? Или несчастье какое с тобой приключилось?

И птица ответила мне:

— Вижу повсюду сегодня знамена в трауре. Того, кто растил этот сад, того, кто с младенческих лет трудился, его расчищая, — не стало сегодня. Могу ли я петь в этот день, когда у садовников горе!

Молча покинул я птицу.

Над горами была тишина, но тучи сгущались в ущельях. Вижу, в глубоком овраге, голову низко склонив, тур быстроногий стоит неподвижно.

Я близко к нему подошел:

— Что с тобой?—спросил я его.—Ведь рядом чудесные скалы, ведь рядом широкие, полные солнца и трав, развернулись долины, а ты в этом тесном овраге — один... Что за печаль у тебя, житель вершинных просторов?

И тур отвечал мне:

— Пал большой человек, боровшийся во имя свободы, во имя сверкающих солнцем долин, во имя широких просторов. И в трауре спустился я в тесный овраг.

Молча покинул я тура.

Была тишина над горами, но буря ревела в ущельях, но молнии в тучах сверкали.

Ворочая камни большие, качая высокие скалы, дробя и ломая, круша и взрывая русло, несся клокочущий черный поток... Пеной своей обдавая соседние горы, с корнем, с землей вырывая столетние сосны, он несся стремительный, грозный, могучий...

Тогда закричал я навстречу потоку:

— Не надо! Постой!... Ведь к морю и так ты дойдешь, все равно, и в пенных клокочущих волнах своих успеешь корабль врага потопить!

Ответил поток:

— Я не в силах сдержать сердца гнев. Горы взрывая на воздух, моря осушая до дна, найдем мы зловонную нору, отыщем врага, он от нас не уйдет... От нас не спасется предатель!

(Записано в 1935 г. со слов Абуталиба Гафурова в с. Кумух, Лакского района, Дагестанской АССР).

БУДЗЕМ УСЕ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА ВАРАШЫЛАВА І ВАНЕЕВА!

Вышэй якасць агітацыі і прапаганды на выбарчых участках!

Агітатары на ўчастку

Асталіся лічаныя дні да выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Перад партыйнымі і непартыйнымі большэвікамі стаіць задача — забяспечыць галасы пагалоўна ўсіх выбаршчыкаў іх участка ў карысць кандыдатаў, зарэгістраваных ад Менскай гарадской выбарчай акругі.

На 26 выбарчым участку працуюць больш 40 агітатараў універсітэта. Большасць з іх добрасумленна адносіцца да сваіх абавязкаў, прапрапоўвае сярод выбаршчыкаў Палажэнне аб выбарах, праводзіць агітацыю за кандыдатаў у Вярхоўны Совет СССР—таварыша Варашылава і Ванеева, знаёміць выбаршчыкаў з іх жыццём, з іх заслугамі перад соцыялістычнай радзімай.

Асабліва добра працуюць агітатары: Шац, Дучыцкая, Папова, Бабчонак, Кавалёў, Бернштэйн. Гэтыя таварышы завяявалі добры аўтарытэт сярод хатніх гаспадынь. Яны ўмела праводзяць гутаркі з выбаршчыкамі, арганізуюць экскурсіі на Ўсебеларускую выстаўку, у Дом Чырвонай Арміі і т. д.

Аднак, на вялікі жаль ёсць і такія агітатары, якія не зразумелі сваіх вялікіх і адказных задач. Так, напрыклад, выключна дрэннымі агітатарамі з'яўляюцца Слепчын і Сцяпук. Яны мала калі бываюць на ўчастках, не рыхтуюцца да гутарак.

У адносінах Слепчына неабходна сказаць, што камітэт комсамола наогул зрабіў памылку, што вылучыў яго ў агітатары, бо ён у грамадскім жыцці ва ўніверсітэце меў вялікія палітычныя памылкі.

Неабходна парткому, камітэту комсамола і прафкому яшчэ раз праглядзець склад агітатараў і аставіць лепшых, адданых справе Леніна—Сталіна, здольных аказаць большэвіцкую дапамогу ў правядзенні выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

РУСІНАЎ.

АПРАЎДАЮ ВЯЛІКАЕ ДАВЕР'Е

Я працую агітатарам на 34 выбарчым участку. Займаюся з хатнімі гаспадынямі дома № 13 па Няміга-Ракаўскай вуліцы. На занятках бываюць заўсёды амаль усе хатнія гаспадыні, каля 15—20 чалавек. Усе яны з вялікай ахвотай прадастаўляюць свае кватэры. Ужо праведзена 8 занятак, на якіх вывучалі Сталінскую Канстытуцыю і выбарчы закон, біяграфіі таварышоў Сталіна і Варашылава, а таксама і нашага кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей тав. Ванеева.

На днях мы праслухалі на патэфоне даклад таварыша Сталіна на VIII Надзвычайным З'ездзе Советаў. На наступных занятках мяркую расказаць аб міжнародным становішчы.

Выбаршчыцы на занятках успамінаюць аб сваім цёмным, горкім, беспрасветным мінулым і з радасцю гавораць аб радасным цяперашнім. У сваіх выступленнях хатнія гаспадыні дзякуюць за шчаслівае і радаснае жыццё нашу партыю і любімага правадыра народаў таварыша Сталіна.

Я пастараюся на гэтай адказнай рабоце апраўдаць вялікае давер'е, аказанае мне партыйнай і комсамольскай арганізацыямі.

ЮДЗІН.

АГІТАТАР ПАЕХАЎ НА ПАЛЯВАННЕ

Мы не супроць паляванння, але мы рашуча выступаем супроць таго, калі цяпер, у самы адказны час, напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет СССР, агітатар тав. Лычкоў паехаў на зайцаў. Мы тут не будзем падрабязна займацца жыццём-быццём Паўлы Лычкова, аднак, укажам, што гэты чалавек амаль ніколі не чытае газет, не чытае мастацкую літаратуру і наогул нічога не чытае, ніколі не бывае на палітзанятках, лекцыі наведвае па выбару, і ў гэты час камітэт комсамола вылучыў яго на вельмі адказную і ганаровую работу, быць агітатарам на выбарчым участку.

Цяжка сказаць, як Лычкоў працуе на ўчастку, як ён растлумачвае Сталінскую Канстытуцыю, выбарчы закон, агітуе за нашых кандыдатаў, бо ніхто і ніколі не бачыў, каб ён рыхтаваўся да гутаркі. Неабходна таксама тут-жа адзначыць і тое, што першы час Лычкоў наогул мала заглядваў на ўчастак, а 25 лістапада зусім паехаў на паляванне.

У той час, калі пішуцца гэтыя радкі, калі лічаныя дні асталіся да гістарычнай даты — 12 снежня — Лычкоў па гарачых слядах бегае за лісіцамі, зайцамі і іншымі звярамі.

Камітэт комсамола павінен зрабіць належны вывад.

А.

СТАЛІНУ ДЗЯКУЙ

Радасныя дні перажывае наша краіна. Ва ўсіх яе кутках, як-бы далёка яны ні знаходзіліся, совецкія людзі з вялікай гордасцю рыхтуюцца да знаменальнай даты, да дня выбараў вярхоўнай дзяржаўнай улады. Мы, студэнты, перажываем зараз двайную радасць: палова з нас упершыню будзе галасаваць за сваё шчаслівае юнацтва, а ўсе мы разам першы раз у жыцці будзем прымаць удзел у выбарах па сталінскаму закону. Другая наша радасць, некалькі дзён таму назад мы атрымалі першую палучку павышанай стыпендыі.

Трэба было быць у вучэбных карпусах у той дзень, калі былі атрыманы газеты з пастановай урада аб павышэнні стыпендыі і бачыць радасныя тзары студэнтаў. Юнакі і дзяўчаты пацісналі адзін аднаму рукі, віталі адзін аднаго, смяяліся, бегалі, як дзеці па карыдорах і ў кожнага лепшыя мысліі пачуцці былі накіраваны да сэрца краіны, да Чырвонай Масквы, да Крэмля, да вялікага Сталіна. У кожнага з нас на вуснах былі адны словы. «Сталіну, дзякуй!».

І калі высокі паэтычны настрой перайшоў на звычайную прозу жыцця, кожны з алоўкам у руках вылічыў прыбаўку. Прыбаўка аказалася нямалай: хто раней атрымліваў 94 рублі, зараз атрымоўвае 130 рублёў, хто—104, той зараз—150, хто—114, той зараз—175, а на пятым апошнім курсе стыпендыя ўстаноўлена ў 200 рублёў. Цяпер можна лепш харчавацца, лепш апранацца і самае галоўнае лепш вучыцца.

— Сёння жывём лепш, чым учора,— гавораць кожны з нас і аб гэтай радаспіша сваім бацькам, братам, таварышам, знаёмым.

Ніколі і нідзе, ні ў адной краіне света студэнцтва не мела такіх бацькоўскіх клопатаў урада, як у нас. Наша партыя і наш урад прадстаўляюць моладзі самыя найлепшыя умовы для жыцця, работы, вучобы. Перад кожным маладым грамадзянінам у нас шырока расчынены дзверы у жыццё. «Выбірай любую прафесію, расці, стварай, прабуй,—няма і не можа быць над сонцам нашай радзімы ніякіх перашкод для чалавека, жадаючага працаваць над сабой, вучыцца, развіваць свае здольнасці і таленты. Вось чаму ўсе народы совецкай краіны славяць сваю краіну і на ўсіх мовах гавораць аднолькава горда гучачыя словы:

«Мы самыя шчаслівыя людзі!» («Правда»).

12 снежня мы, грамадзяне вялікай краіны Советаў, з мыслямі: «Сталіну, дзякуй!» пойдзем з вялікай гордасцю галасаваць за наша шчаслівае, радаснае сёння і яшчэ лепшае заўтра, за нашага слаўнага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Клімента Варашылава.

Я. ПАЎЛОЎСКІ.

ШТО ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ ВЫБАРШЧЫК

ЯК БУДУЦЬ ГАЛАСАВАЦЬ НЕПІСЬМЕННЫЯ І ІНВАЛІДЫ

Выбарчы закон і дадатковыя пастановы совецкага ўрада накіраваны к таму, каб ні адна група выбаршчыкаў не была пазбаўлена фактычнай магчымасці прыняць удзел у выбарах. У гэтым выражаюцца найвялікшыя клопаты дзяржавы, рабочых і сялян аб кожным грамадзяніне, жаданне забяспечыць фактычную магчымасць усім і кожнаму прыняць удзел у выбарах вышэйшага органа ўлады.

Нраяўленнем найвялікшых клопатаў да выбаршчыкаў з'яўляецца, у прыватнасці, артыкул 81 «Налажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР».

«Выбаршчыкі, якія не маюць магчымасці ў сілу непісьменнасці або якога-небудзь фізічнага недахопу самастойна запоўніць выбарчыя бюлетэні, управе запрасіць у пакой, дзе запаўняюцца выбарчыя бюлетэні, любога іншага выбаршчыка для запаўнення выбарчых бюлетэней».

Непісьменныя выбаршчыкі павінны будуць скарыстаць права, якое прадастаўлена артыкулам 81 «Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР», і запрашаць каго-небудзь на дапамогу для запаўнення выбарчых бюлетэней.

У такім-жа становішчы акажуцца і асобы, якія страдаюць якім-небудзь фізічным недахопам. Справа ідзе аб сляпых, бязрукіх, гэта значыць аб інвалідах, якія не маюць магчымасці без пабочнай дапамогі, самастойна запоўніць бюлетэнь.

Усе гэтыя грамадзяне ўправе запрасіць з сабой у кабіну, дзе будуць запаўняцца бюлетэні, любога іншага выбаршчыка. Бясспрэчна, гэта павінен быць чалавек, які карыстаецца безумоўным давер'ем выбаршчыка, вымушанага звярнуцца да яго дапамогі. Выбаршчык павінен быць упэўнен, што асоба, да садзейнасці якой ён звяртаецца, не скарыстае на зло аказанае яму давер'е, не скажыць яго волю.

За выключэннем членаў данай выбарчай камісіі, такім дапаможнікам можа быць любы грамадзянін, не пазбаўлены выбарчых правоў.

Задача заключаецца у тым, каб і непісьменныя і асобы з фізічнымі недахопамі загадзя і сур'ёзна падумалі аб тым, каму даверацьяны рэалізаваць у бюлетэнях сваю волю выбаршчыка. Агітатары, даверапыя асобы павінны пабываць дома ў гэтых выбаршчыкаў, у гутарцы дапамагчы ім выбраць чалавека—члена сям'і, асабіста знаёмага, суседа па кватэры, таварыша па рабоце і т. д., які дапаможа непісьменнаму або інваліду ў дзень выбараў. Грамадзянскі доўг такога памочніка— не падвесці свайго давярыцеля, дакладна ў вызначаны час сустрэцца з ім, прывезці ў памяшканне для галасавння, атрымаць бюлетэні і канверт, пайсці ў кабіну, дапамагчы запоўніць бюлетэні.

Участковыя выбарчыя камісіі павінны будуць паклапаціцца аб гэтай катэгорыі выбаршчыкаў. Ні ў гарадах, ні ў сёлах не складзе рашуча ніякай цяжкасці прымацаваць 12 снежня к участковай выбарчай камісіі легкавую машыну або каня. Можна ў загадзя ўмоўлены час прывезці і адвезці дадому кожнага выбаршчыка з фізічнымі недахопамі.

Агітацыйна-прапагандысцкая і арганізацыйная работа неабходна, каб дапамагчы кожнаму непісьменнаму выбаршчыку і кожнаму выбаршчыку з якім-небудзь фізічным недахопам з'явіцца на выбары гаспадаром сваёй волі, а не папасці ў лапы нядобрасумленнага «советчыка».

(З газеты «Правда»).

ПІСЬМЫ У РЭДАКЦЫЮ

ФІЗМАТ ПАВІНЕН ПЕРАБУДАВАЦЬ СВАЮ РАБОТУ

Некалькі раз шматтыражка пісала аб дрэнных баках работы фізмата, але як бачна справа на факультэце ідзе параму.

У галіне педагагічнага працэса па-ранейшаму рад недахопаў: адсутнічае спецыяліст па кафедры фізікі, зусім нізкая якасць выкладання курса фізікі на III курсе і методыкі фізікі на IV і V курсах (выкладчык Нелеп), студэнты рыхтуюцца да дзяржаўных экзаменаў па тэарэтычнай механіцы па запісках, у той час, калі па гэтаму прадмету ёсць вялікая навуковая літаратура. Прафесар Сталяроў выкладае гэты курс па ўстарэлай сімволіцы і прызнае толькі адзіны навуковы аўтарытэт у сваёй асобе. Усе гэта і прывяло да таго, што студэнты не карыстаюцца навуковай літаратурай па тэарэтычнай механіцы.

Вытворчая практыка IV курса пад пагрозай зрыву. Дэкан фізмата тав. Гельфанд не ведае, дзе будзе яна праходзіць і які будзе насіць характар.

Пара дэканату канчаткова ліквідаваць вынікі шкодніцтва на факультэце.

К.

Яшчэ раз пра геафак

За тры тоды свайго існавання кафедра геаграфіі нічога не зрабіла ў галіне навукова-даследчай і педагагічнай работы.

У гэтым годзе яе становішча нічым не змянілася. Загадчык кафедры тав. Зудзілін нічога не робіць, каб забяспечыць яе работу, а наадварот, сам нядбайна адносіцца да выкладання курса эканамічнай геаграфіі. З гэтага курса ён ужо сарваў каля 30 гадзін.

Курс геаграфіі СССР вядзе Дземенцьеў, які не можа па сваёй падрыхтоўцы з ім справіцца. Адна з галоўных дысцыплін, такім чынам, праходзіць зусім нядобраякасна.

К месцу будзе тут сказаць, што геафак упустую многа растрачвае дзяржаўных сродкаў: за загадванне геаграфічным кабінетам у мінулым годзе нарэшце атрымліваў тропы бяздзельнік Стральцоў, а ў сучасны момант у кабінет пасадзілі двух «штатных дзяжурных», якія атрымліваюць зарплату, але не робяць таго што патрэбна для работнікаў навуковага кабінета.

Не лепш было-б пасадзіць у кабінет вопытнага кансультанта, які па-сапраўднаму кіраваў-бы кабінетам і дапамагаў вучыцца студэнтам.

Трэба нарэшце, сказаць, што факультэт па сутнасці не мае кіраўніцтва. Дэкан тав. Андрушчанка занадта часта «хварэе», а яго намеснік тав. Зубрыцкі бездапаможны ва ўсіх арганізацыйных пытаннях.

СТУДЭНТ.

КОЖНЫ ВЫБАРШЧЫК ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ СВОЙ УЧАСТАК

На выбарчых участках вывешаны спісы выбаршчыкаў. Кожны выбаршчык абавязкова павінен пайсці на свой участак і праверыць, ці ўключан ён у спісы, ці ўсё правільна запісана і наогул павінен дакладна ведаць, куды ён павінен ісці ў гістарычны дзень — 12 снежня — аддаць свой голас, выбраць лепшых людзей нашай краіны у Вярхоўны Совет СССР.

Запамятайце: інтэрнат па Маскоўскай, 15 уваходзіць у 72 выбарчы ўчастак (школа № 44); інтэрнат па Калініна № 8 — выбарчы ўчастак 33 (школа № 26); інтэрнат па Нова-Мясніцкай, 26 — выбарчы ўчастак № 33 (школа № 26); інтэрнат па Студэнцкай, 52 — выбарчы ўчастак 79 (Студэнцкая вул., інтэрнат № 40); інтэрнат у Антопаве — выбарчы ўчастак 22 (Правіянская вул. дом № 79-а, кантора завода Будматэрыялаў), інтэрнат рабфака — выбарчы ўчастак 41 (Рэвалюцыйная, 28, школа № 30).

Менск, друкарня «Звязды». Тыраж 1.000 Горліт № 2434 Адказ. рэдактар Л. КАМІНСКІ.